Аляксей
Пысін

ЁСЦЬ НА СВЕЦЕ МОЙ АЛЕНЬ

ВЕРШЫ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1978

МАСТАК Г. МАЛЫШАЎ

Бел 2
П 94

П $\frac{70403-120}{М 302(05)-78}$ 57—78

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура». 1978 г.

Здаецца, ўстаў я рана-рана,
Пайшоў па сцежцы лугавой,
Ды хтосьці ўжо ступаў па ёй,
Раса пазбіта і стаптана.

Здаецца, лёг я позна вельмі,
Ды чуў праз сон, як і пасля
Натужна ўздрыгвала зямля,
Чыесьці крокі ўсё грымелі...

1972

Віншавальныя паштоўкі

Дарагія
Пабрацімы і сястрычкі,
Гэта ж мы не бачыліся столькі!
Ўсесаюзнай сталі пераклічкай
Нашы віншавальныя паштоўкі.

Ёсць дарогі — лёсу пупавіны,
Ёсць зямля, што нас усім абдорвае.
Як жывецца? Добра жыць павінны —
Узаемна зычым толькі добрае.

Так сяброўства франтавое грэе,
Так на кожным свяце абдымае!
І ніхто як быццам не хварэе,
І ніхто, ніхто не памірае.

Ды не стаць паўзводна і паротна,
Ну, а ў смерці не адзін чаляднік...
І святочна сёння і маркотна —
Не азваўся весткаю Чалябінск.

З поштаю ў нас добрае знаёмства,
Ды згубіла, мусіць...
Не даслала.
Адыходзім... Не, мы застаёмся
Песняю, што на крыві стаяла.

1972

Вецер па-свойску сустрэчны,
І жураўлі над ракой —
З боку таго, дзе сардэчны
Друг, аднагодак мой.

Бачу скроні сівыя,
Усё ж ён ранейшы ва ўсім:
— Дзеці ў мяне малыя,
Трэба мне быць маладым.

Быццам не белены лёсам,
Быццам не зведаў страт,
Брат гэтым белым бярозам,
Добраму, юнаму брат.

Рана ў дні веснавыя
Ў поле — з сонцам самім:
— Дзеці ў мяне малыя,
Трэба мне быць маладым.

Дыхае свежай зямлёю,
Чуў ён, што зычылі ёй
Белыя сцюжы зімою,
Белыя птушкі вясной.

Турыць хваробы злыя,
Лечыцца ўздыхам адным:
— Дзеці ў мяне малыя,
Трэба мне быць маладым.

1972

Туркоча дзікі голуб на сасне,
І водгулле ў сухім палене.
Адсвяткаваць бы захапленне,
І хай усё благое нас міне!

Ўсё лес і лес. Далёка гул палёў,
Дарожны пыл, спяванне рэек.
Журботна і шчымліва неяк
Ад туркату нябачных галубоў.

Адчулася — як быццам бы адзін
Застаўся я на белым свеце,
Мяне забылі нават дзеці,
І я нічый ні друг, ні брат, ні сын.

Мільёны год да поля і шашы
Вы, продкі, йшлі,
і стогн птушыны
Біў,
як і ў гэтую часіну...
Відаць, боль продкаў у маёй душы.

І ёсць віна, мой лес, перад табой:
За тое ж мёртвае палена,
За птушанё, што акалела,
За ўсе набегі браканьера
Плачу я сёння болем і журбой.

Туркоча дзікі голуб на сасне
Сваю элегію лясную.
Дамоў вярнуся, засумую,
І, можа, зноў пакліча лес мяне.

1972

Жалезніца, Касцягаўка, і Горна,
І вёска маці — светлыя Мануйлы.
Журба і радасць ціхая агорне:
Вы ёсць, не адляцелі, не мінулі!

Была радня аж дзесьці ў Саматэвічах,
За Бесяддзю, за полем і барамі.
У вёсках тут прыгадваюць Бялькевіча:
«Краёвы слоўнік» разам мы збіралі...»

Чытаю, перагортваю я слоўнік,
Нібы ў бабульчынай гасцюю хаце:
— Прысядзь, маё ты дзетка, на услоне,
А як жа бацька твой, а як жа маці?..

А добра мне. І маці не старая.
І брат жывы. І ходзяць к нам суседзі.
Вайна нікога ў нас ні забірае,
І дома ўсе дарослыя і дзеці.

Яшчэ няўцешна ўдовы не галосяць,
Яшчэ касцоў гарматы не гукалі.
І тыя, што забіты, сена косяць,
Ядуць на лузе сала з агуркамі...

1972





Аддаваў цябе лесу, і бору,
І далёкім палям, і лугам.
Не было ні жальбы, ні дакору,
Так, здавалася, думаў я сам.

Не на іншую сыдзеш планету,
Захачу — даганю, будзе след.
Схамянуўся — ні сцежкі, ні следу,
Толькі луг, толькі лес, толькі свет.

Я гляджу праз гадоў павалоку:
Не гукнуць, не дагнаць, не дайсці.
...Усміхаешся блізка
здалёку,
Як зялёная зорка ў лісці.

1972

Па-над горадам у сіняве
Лета бабіна без павуціны.
Прылятаюць восы да мяне —
Жоўтыя,
зялёныя пункціры.

Прылятаюць восы на балкон,
Тонкія падгалістыя восы.
А балкон — жалеза і бетон,
Дзе той горкі мёд і меданосы!

Асыпалі яблыні на дол
Белую парошу трапяткую.
Ды не бачыў я вясною пчол,
І хоць вос я сёння пашкадую.

Не, не снілася і каралю
Чаяпіцце вось такое — сподкі
На балкон выношу і кармлю,
І частую вос усім салодкім.

Чынш людской прыязнасці аддам
Усяму, што ў лесе, полі, лузе,
Бо таго не ведаю я сам,
Чым яшчэ на гэты свет з'яўлюся...

Па-над горадам у сіняве
Лета бабіна без павуціны.
Восы, восы, восы —
да мяне,—
Жоўтыя,
зялёныя пункціры.

1972

Мы па латгальскай крочылі зямлі
І дыхалі жывіцай і туманам.
Вітаў нас дзед у белым палатняным,
Мы чэсць яму таксама аддалі.

І быў ён з намі ў кратэры баёў,
І, белы-белы, ён чарнеў ад гора...
Былога воіна хто ў стэп, хто ў горы
Услед за люстрам памяці павёў.

Пакуль жывём — і дзед наш будзе жыць,
Гляджу — ўсё той жа ён у белай белі,
Не пастарэў, хоць мы і пастарэлі,
Ніколечкі не пацямнелі
Яго Георгіі — крыжы.

1972

А снег — у кожнага ён свой,
Як сон, як госць каля парога,
Як зноў адчутая трывога,
Як суцяшэнне і спакой.

За снегам снег... Агляд пачні
Са дня забытай снежнай «бабы»:
І сцежка ў школу, і забавы,
І даўні бой перад вачмі.

І як бы сёння ні мяло,
Якія б ні плылі сумёты,
Свой снег пазнаю я заўсёды —
Ў ім бачу тое, што было.

І як бы ў свеце ні мяло,
Свой снег пазнаю сёння й заўтра,
Бо ён пражытых зім сааўтар
І нешта ў ім заўжды мае.

Патрэбны нам прастор палёў,
Каб густа высяваць на роўнядзь
І непадбеленую споведзь,
І да зямлі сваёй любоў.

Ляціць, вітаючы мяне,
Мой снег,
                    як свет, як лёс, багаты
На боль, на радасць і на страты,—
Зноў свеціць,
                              сляпіць
                                        і мяце.

1972

Апошні снег і першы дожджык
Сустрэлі ў гэтым гарадку.
А я іду к палітруку,
А палітрук таварыш Доўжык.

Ды чую я ў адказ, як рэха:
Маўляў, на пенсіі даўно.
Яшчэ сказалі заадно,
Што ў Істру ён чамусьці з'ехаў.

Але звычайнага турыста
Ў ім не спяшаюся пазнаць,
Таму і хочацца сказаць:
«Я ведаю, пры чым тут Істра!»

Там франтавое поле, поле,
Там найглыбейшае з палёў —
Па ім, па ім
ён роту вёў —
О поле бою,
поле болю...

Што ж цягне нас, аднапалчане,
Да тых палёў, дзе спяць сябры,—
Няўтольнасць даўняе журбы
Ці ўчуты смутак прадчування?

1972

Старому, мусіць, дзевяноста
(Да дзевяноста б вам і мне!),
Ды вельмі, вельмі ўжо дзівосна
Прымерваць старасць на вайне.

Мы з ім, героем Леадуна,
Спаткаліся — і будзь здароў!
Пад грукат бою каля дзюнаў
Хавалі дарагіх сяброў...

Даўно старэю не па ўзросце,
І, можа, ўсё таму, братва,
Што вельмі дзеду пазайздросціў,
Калі было мне дваццаць два.

1972

З самай раніцы абход пачне —
І па Віленскай і Падніколлі.
Кажуць, быў кантужан на вайне,
І таму вось штосьці з ім такое.

Лістапад ці нават снегапад —
Тыя ж боты і кашуля тая.
І, хаця даўно ён не салдат,
Па-салдацку кожнага вітае.

Крочыць, не схіліўшы галавы,
Пасівелай, стрыжанай, вялікай.
Не крыўдуе, што чамусьці вы
Ані слова — хоць бы для прыліку.

Памяць доўга памірала ў ім,
Не пакінула ні крыўд, ні злосці.
Прывітанне, прывітанне ўсім —
Гэта ўсё, што ўменню асталося.

І зусім маўклівыя прад ім
Дрэвы, неба, галубы і лужыны.
Прывітанне, прывітанне ўсім —
Нібы ў сонца ён цяпер на службе.

1972

Так грымела, так свяціла
Пры дажджы і без дажджу.
Ноччу гэтай ноч судзіла
Добрую маю душу.

Я,
    чакаючы расплаты,
Думаў — як ты ні глядзі,
А, вядома, вінаваты
Перад светам і людзьмі.

Абяцаў я ўсім даволі
Светлай радасці і свят.
А на свеце войны, войны,
І таму я й сам салдат.

Пажадаў (даймала мара)
Свет засеяць дабрынёй.
Ды яе
        цяпер вось мала
Нават для цябе адной.

Так грымела, так свяціла
Пры дажджы і без дажджу.
Ноччу гэтай ноч судзіла
Грэшную маю душу.

1972

Ёсць на свеце мой алень,
Ёсць і гэткае маленне:
Будзь заўсёды у аленя,
Цёмны мох і светлы дзень!

Вы, разумныя браты,—
Я і сам страляць умею —
Дайце жыць майму аленю
Пад галінкай дабраты.

Вось у цішыні лясоў
Ліст трапеча счырванелы.
Можа, гэта страх аленя
Тут асінкаю ўзышоў?

Я іду, іду між дрэў
Па асінавай алеі.
Мне пабачыць бы аленя...
Зноў я чую блізкі стрэл.

1972

Хоць сэрца хтось лічыў жывым,
Быў дух мярцвячыны у ім:
Жыло сумленне, ды яно
Забіта ў сэрцы тым даўно —
Забіта сытасцю,
Забіта хітрасцю,
Забіта сквапнасцю,
Забіта святасцю,
Забіта хіжасцю
І іншай іншасцю.
...Таму арол на полі бою
Вартуе сэрца не любое.

1972

Ветракі старыя, ветракі
Ў чыстым небе, ў ціхім полі.
Вы грымелі, вы малолі,
Ўсім вятрам і сонцу сваякі.

Хоць ніхто не скажа — лайдакі,
Не вязуць вазоў вам коні;
Сыплюць белы пыл на скроні
Ўжо з-пад іншых жорнаў латакі.

Абяскрылены даўно вятрак
Флюгерам свой ветрык ловіць.
Дзядзька мой Дзям'ян Пятровіч
З дзівакоў найбольшы ёсць дзівак.

Заўтра дзядзьку восемдзесят пяць,
Раненька ўстае (не спіцца)
І выходзіць (нават спрытна)
Дзень будзіць і сонца падымаць.

Падымае яблыні свае,
Птушак, жабянят маленькіх.
І ўсё робіць без малення,
Так наіўна, проста, як жыве.

Ветракі старыя, ветракі
Ў чыстым небе, ў ціхім полі.
Вы грымелі, вы малолі,
Ўсім вятрам і сонцу сваякі.

1972

На дрэвах пры бальшаку
Птушыную вёску ты ўбачыў?
Умоваю нейкай задачы —
На кожным суку па граку.

Бязмоўнасць, знямеласць сама
Выстуджвае сціхлыя гнёзды.
Вядома, марозны дух грозны,
Вядома, вядома — зіма.

Бязмоўнасць пад ботам рыпіць.
Далёка адлётныя птахі,
І дрэвы, і неба, і дахі
Не ўмеюць без іх гаварыць...

Ї сам я душою нямеў
Без нечага шчабятання.
Жывіце
          у кожным чаканні,
Надзеі,
          і дружба, і спеў!
1972

— Па-лабавому зноў, дзівіцеся! —
Што адкажу на гэта я?
Была мне школаю мая
Гвардзейская дывізія.

Паспелі —
Шлях быў не малы —
І падрасці і вырасці.
І мы не ведалі няшчырасці,
Халуйства, зайздрасці, маны.

Даўно час выставіў адзнаку
Сумленню мёртвых і жывых.
Я помню, помню радавых,
Што ў поўны рост ішлі ў атаку.

І, можа, болей, чым хто іншы,
Я лёсам абавязан ім,
І болем вернасці,
І тым,
Што не нясу благому
Чыншу.

О, слова, слова лабавое,
Нястрымнае, яно ляціць,
Пасля душа мая баліць:
Сказаў не так,
Сказаў не тое...

1972

...А хтосьці з той стралковай роты
Падняўся першы. І загінуў.
І стаў пяском, травою, глінай.
Ты быў другі. А можа, соты.

А можа, тысячны, мільённы.
А можа, нават быў і воддаль.
Заслужаны ты маеш ордэн.
Мы ворага перамалолі.

Цяпер ссівелы, пастарэлы,
Усё часцей, часцей міжволі
Сябе ўяўляеш на тым полі:
Ты самы мужны, самы смелы.

І ўжо не соты, не мільённы,
А першы, першы ў той атацы.
Паверце... Дакараць не станьце...
Галоўнае — перамалолі.

1972





І мне памяняць бы кватэру,
Туды б,
дзе цішэй і ніжэй,
Бо грукату зведаў праз меру,
Няўтульных і дзён і начэй.

Заўсёды гатовы ў дарогу
І ногі і спіны сталоў.
І буду выносіць патроху
Сто важкіх шаноўных тамоў.

І нават фарфоравы коцік,
Якога цярпець не магу,
Свой банцік ружовы падхопіць
І стане за кімсьці ў чаргу.

Агледжу вузлы, чамаданы...
Чакайце, грузавікі,—
А песні, што тут праспяваны
На горкім вяселлі дачкі?

А цені сяброў, што ніколі
Не ступяць на іншы парог?
У гэтым абжытым пакоі
Я ўсё дарагое бярог...

Не сплю і сузор'і чытаю.
А можа, па іх варажу,
А можа, кагосьці чакаю?..
Даброт і выгод не прашу,
Нічога не варушу...

1972

Ёсць гарадок паміж бароў,
А ў ім нябачны з берагоў
І кручаў Сожа, быццам схоў,—
Каханы Роў.

З былых часоў, з былых вякоў
Таіў і шанаваў любоў,
На шлюбны ложак юных вёў
Каханы Роў.

Святло чаромхавых кастроў
Сышло з падземных вапнякоў.
І вабіць зноў і кліча зноў
Каханы Роў.

Спытайце нават салаўёў,
Спытайце нават матылёў,
Што трэба ім? Адказ без слоў:
— Каханы Роў.

Не прыглядайся да зямлі,
Да тых слядоў, што тут ляглі,—
Пакуты й смерць таксама йшлі
Ў Каханы Роў.

Святло чаромхавых кастроў
Сышло з падземных вапнякоў.
І вабіць зноў і кліча зноў
Каханы Роў.

1972

Пасадзілі ля дома бярозку,
Пажадалі ёй добрага росту,
Каб на радасць і ўнукам была.
Пацягнулася тонкае дрэўца,
І туды і сюды трапянецца —
Не хапае апоўдні святла.

Ценем хтось атуляе адразу,
Выпадае так мала ёй часу
Гнаць угору галінкі свае.
Ўсёй істотай яна адчувае:
Побач той, хто яе засланяе,
Хто паўсвета бярэ ад яе.

Трапянецца і ўправа і ўлева:
Ах, якое вялізнае дрэва,
Не абмацаць яго, не абняць!
Дзе ж ёй ведаць душою лясною,
Што не дрэва, а дом па-над ёю,
Не шпакоўні — балконы вісяць...

1972

Не, не ўсё наўмысна робім,
Толькі ўсім, што нам баліць,
Памагаем добрым быць
Мы таму ў сям'і людской,
Хто умее сэрцам добрым
Боль чужы адчуць як свой.

Памагчы й падлюгу можна:
Перасільце боль і гнеў,
Дайце, дайце, каб даспеў,
Паварочваўся між нас,
Як наглядны дапаможнік,
Той, што дзецям напаказ!

1972

Знаёмы дзядзькаў двор. Каля двара
Бязлюдна,
Быццам на пустым пароме.
Даўно жыве адна
Праскоўя-Проня,
Стрыечная
Сардэчная
Сястра.

Мы пасядзелі сціпла за сталом,
Мы родныя наведалі магілы.
Мы аб усім, відаць, пагаманілі,
Паслухалі гусей па-над стаўком.

Дыхнула восень. Жоўты ліст ляціць
Пад чорнае пад гумавае кола.
Вучыла Проня ў пачатковай школе,
І ўжо няма каго вучыць.

На вуліцы,
Мне не чужой,
Вітаем мы сівых пенсіянераў,
Намнога болей іх, чым піянераў,
Няўжо й калыска сыдзе за дзяжой?

А я ні ў чым нікога не віню,
Бо ведаю, што сам у першым класе
Маўкліва ў вечнай вернасці пакляўся
Сваёй зямлі,
і плугу,
і каню.

Але бываю ў вёсцы ўсё радзей
І развучыўся плугам я валодаць,
І, хоць люблю я луг і ў лузе лотаць,
Які зямлі я сёння дабрадзей?

І мне,
Не ўзятаму вайной,
Пазбаўленаму спадчыннага звання,
Я ведаю, не будзе пахавання
Пад матчынай спагадлівай сасной...

1972

Мяркуй, што робіш для душы сваёй —
Шпакоўню, вулей, сціплую кармушку:
Падобны ў чымсьці на пчалу і птушку,
Ты б мог прыйсці ў свет птушкаю, пчалой.

Ты б мог прыйсці бярозкаю, што ссек,
Мурашкаю, што сок з пянёчка выпіла.
Ў істоце той, якою быць не выпала,
Сябе адчуй хоць зрэдку, чалавек!

1973

Што світанне ў вербах тоіць,
Што малюе цень сасны?
Толя,
        Толя Сербантовіч,
Узыходзіць з баразны.

Быццам бы шаптанне дрэва,
Быццам выдых позніх траў:
— Шкадаваць мяне не трэба,
Сам я іншых шкадаваў!..

Вось яршысты ўжо, як выклік,
Вось і мае кулакі:
— Не глядзі, што ты вялікі,
Я не дам табе рукі!

Хто прад ім — змрок несагрэты,
Ўяўны друг ці нават бог?
З кім ваюе, з кім дагэтуль
Прымірыцца ён не змог?

Анікога ў чыстым полі
Пры сасне і пры вярбе.
Сербантовіч,
                Толя, Толя,
Проста
        ўспомніў я цябе...

1972

Вось так ляжы сабе, нібы на пляжы,
Душу студзі і грэй,
Абскубаны, лахматы, ўвесь у сажы
За шыбай верабей.

Інфаркт, аварыя, вайна сусветная
Цябе зваліла, брат? —
Яршысты жэўжык гэтага не ведае,
Ды вераб'ю ты рад.

З твайго маленства, з матчынага ганку
Праз пекла і мароз
Ён казку добрую і калыханку
Даверліва прынёс.

У галавах нячутна сядзе казка,
Ўся з сонца, ўся з вясны.
І сон забытая пасцеле ласка:
— Засні, дзіця, засні...

1973

Не ўгнацца мне за тымі маладымі.
За іх пявучай лёгкаю хадой.
Відаць, гады, што сталі ўжо маімі,
Шануюць лепш суцішаны спакой.

Ды сівізна — не горкі цвет адчаю.
Яна —
Спеў жаўранка над полем спраў і дум.
І я сябе так часам адчуваю,
Нібы раллёю вечарам іду.

Павольна йду: варочаў я каменне,
Араў глыбокім плугам цаліну.
Спяшайцеся, шыбуйце, пакаленні!
Стаміўся я... І крышку адпачну.

1973

Вы лічыце — птушкі спяваюць
І клопату больш няма?
Не, дзюбу сваю дарма
Не раскрываюць. А высяваюць

На луг і на пустку сыпучую
Кветку з песняю той,
Кветку,
            узлётам, красой
Сонцу,
          блакіту сугучную.

Шмат абышоў я зямлі,
Кветкі не ўбачыў я чорнай:
Спеўныя зерні з сяўні крумкачовай
Не ўпалі ні разу,
Не ўзышлі.

1973

Добры конік «Запарожац»

Міхаілу Шумаву

Займжыць ці запарошыць
(Неспякотна балазе),
Добры конік «Запарожац»
Ездака свайго вязе.

Падаў з неба, падаў з танка,
І таму без ног
яздок.
Добры конік даўся... танна,
«Р» на лбе
з усіх аздоб.

Не была душа за паву —
Ці даверыш бліндажу?
Ўцешную займеў забаву,
Як падумаў пра душу.

Лес. Балота тарфяное.
Чорнай рэчкі берагі.
Можа, шчасце ёсць такое —
Выяўленне дабрыні.

Ты падняў счарнелыя сучкі-карэньчыкі,
Прасвятліў лязом ледзь-ледзь:
Глянулі на свет алені-чалавечыкі,
Сталі плакаць, сталі пець.

І была не казка дзіўная, не ява
І не сон з забытым сном.
І жыццё,
як сонца ў воблаку,
стаяла
З даўнім змрокам і святлом.

Пасвяціла ўсмешка тайны выяўлення:
Пажадайце — ажыве
Добрае людское у сухім палене,
У былінцы і жарстве,

І відушчыя алені-чалавечыкі
Будуць плакаць, будуць пець.
...Пад нагамі ў нас былі сучкі-карэньчыкі,
Не было на што глядзець.

Заімжыць вясна ці восень запарошыць
(Няспякотна балазе),
Добры конік, добры конік «Запарожац»
Ездака свайго вязе.

1973

Я ведаю — я вінаваты,
Са мною, за мною віна.
Даймае віна не адна.
Маўчу, не шукаю спагады.

Спазнілася споведзі позва —
Памылкі, няўдачы лічыць,
Старыя хваробы лячыць
Запозна, запозна, запозна.

Чаму ж я кагось дакараю
І часам для іншых суддзя?
Вы лепшымі будзьце, чым я,—
Так шчыра, так шчыра жадаю.

1973

Прыцягненне

Мог я, мог калісьці нават лётаць,
Падымала не крыло:
На душы ў мяне было так лёгка,
Так бязвоблачна было.

І сябрамі да мяне ляцелі
Птахі, пчолы, матылі...
Сёння і душа мая і цела
Пад уладаю зямлі.

Не дагнаць і не спыніць імгненне,
Што ляціць, як вецярок.
Адчуваю сілу прыцягнення,
Ўсё цішэй, цішэй мой крок.

Прыцягненне — гэта далучэнне
Лёсаў нечых і трывог,
Засяленне светам, напаўненне
Тым, што зведаў і збярог.

Ну, а што яшчэ не адпускае
Ад зямнога рубяжа?..
Хай жа верыцца, што не пустая,
Не глухая ты, душа.

1974

Балада пра камбата

Ні той час, ні той міг не забыты.
Бачу я: на зямную мяжу
Мой камбат апусціўся забіты
І я побач з камбатам ляжу.

Хто там скардзіцца, што ў батальёне
Шмат знямелых штыкоў, мала рук?..
З батальёнам, лічы, нас мільёны —
Так засведчыць бы мог палітрук.

Лёсаў колькі вайна памалола!..
Чорным снегам сыпнула зіма.
Ні дачушкі, ні сына малога
Ў маладога камбата няма.

І атаку мы зноў адбіваем,
За сябе і за вас пастаім,
Хоць вам, дзеці, якіх уяўляем,
Нарадзіцца, напэўна, не ўсім.

...Ты, журба, як адчутая страта,
Вы, трывогі, адкуль, ад каго?
— А мы — дзеці, мы — дзеці камбата,
Мы — адзіныя дзеці яго.

1974

Хмарынку ручаі напояць,
І — ліцца светламу дажджу.
Даўно вядома: песня-споведзь
Умее абмываць душу.

Жыццёвы лёс не вельмі песціць,
Не выдасць шчасця крышку больш.
Аддайце боль і смутак песні,
Аддайце песні сум і боль.

У неба дня, у неба сутак
Памкнецца ўзлёт надзей і дум.
Аддайце песні боль і смутак,
Аддайце песні боль і сум.

І нешта добрае ўваскрэсне,
І сыдзе з сэрца крыўды соль.
Аддайце боль і смутак песні,
Аддайце песні сум і боль.

1974

Не на пляжы у Паланзе,
Не ў бары на паляванні
Бачуся, сябры, я з вамі,
А часцей за ўсё у лазні.

Вы былі ў агні і дыме,
Жартам свецяцца ўспаміны:
«Ў наркамздраў —
дык там памыюць,
Наркамзем —
і гэтак прыме».

Пазнаю цябе, пяхота,—
Венік —
даўні паратунак.
— Дай табе спіну патру я!
— Ну патры, калі ахвота!

Радавыя пры маршчынах,
Хоць і жэзл той неслі ў ранцы,
А якое званне ў працы,
Нават самай мурашынай!

І якое званне ў болю,
Ва ўсяго, што пражыта!
Цела шыта,
перашыта
Кулямі на полі бою.

Сверб даймае, як турбота,
Венік —
толькі й паратунку.
— А цяпер табе патру я!
— Ну патры, калі ахвота!

Ў пекле гэтым сам касматы,
Пары —
мора,
пары —
густа.
Што такое перагрузка —
Знаем, хоць не касманаўты.

Венік стыне...
Ціха, сэрца...

Вось такая ў нас ахвота.
Будзень ёсць.
І ёсць субота.
— Ну, каму... спіну... пацерці?

1974

Сасна і кусты іван-чаю,
Далёка лугі і палі.
Дзе б крокі мае ні былі,
Я вёску ў сабе адчуваю.

Над хатай дымок, як калісьці,
То голуб, то кот на страсе...
Мне вецер з сасны данясе
Рыпенне забытай калыскі.

«Ўсё вёска, і зноў жа пра тое»,—
Хтось, можа, дакорам кальне...
Ёсць горад і вёска ў мяне,
Я зроду не быў сіратою.

1974

Дняпроўскі мост і маладзік адталы
Віншую з першым жаўранкам вясны.
Лугі тут хтосьці выпаліў, яны
Ужо без прэлай леташняй атавы.
Аддай, трава, паклон людскім паслугам!
Палілі і мяне агнём густым...
У валасах нясу ўсё той жа дым,
І не цвіце душа блакітным лугам.

1974

Сабака брэша — лічаць так з вякоў.
А можа, ён не брэша, а вітае,
І гэты брэх яго адпавядае
Людскому, зычнаму: «Здароў! Здароў!»

Сабака брэша — кажуць з веку ў век,
А можа, нават ён і не вітае,
А так, як можа, скача і спявае,
Што вось ідзеш ты, добры чалавек!..

1974

Пахаваны тут франтавікі.
І журба, і сум мяне агортвае:
Гэта ж хто прыдумаў: «мёртвым — мёртвае»
І паклаў бляшаныя вянкі?
Хто прыносіць кветкі папяровыя
На магілы братнія, вясновыя?

Толькі смерць, пакляўшыся труной,
Некалі магла паверыць: паўшыя...
А яны, бяссмерце ўжо спазнаўшыя,
Разам з намі йшлі
Нябачна
Ў бой.
І мы лёсам адчуваем іх,
Лёсам, кожнаю травінкай горкаю.
Гэта ж хто прыдумаў: «мёртвым — мёртвае»,
Калі ўсё, што робім,—
Для жывых?

1974

Па Млечных Шляхах
Пад поўнямі
Вы, родныя вёскі, ляцелі.
На ўзгорках ля рэчкі прыселі
З садамі, млынамі, шпакоўнямі.

Паскідвалі з плеч кажухі,
Калыскі на зоркі павесілі.
Ў счарсцвелым пракладвалі месіве
Барозны, крыніцы, шляхі...

Так свет да мяне ўжо стаў светам,
А я ў сваім першым маі
Убачыў, як сцяг узнімалі,
Чырвоны сцяг
Над сельсаветам.

1974

Пачаць бы дзень звычайны свой,
Пачаць бы так, як дзень сам пачынае,—
З душы, з вачэй сышла імгла начная,
І сонца просіцца ў настрой.
Усё ты можаш ахапіць:
Высока дрэвы памяці ўзняліся,
П'е будучыню
пачуццяў лісце,
Мурашнік дум
кіпіць.
Жыве, працуе і пяе
Дзень непаўторны, дзень тваёй істоты.
На скаргі, крыўду, дробныя згрызоты —
Ну проста часу нестае...

1974

Чайкі

Калышыся, мора, калышыся,
Налівайся сонцам і вятрамі;
У тваім высокім сінім жыце
Ходзяць жнеі з белымі сярпамі.

І не плачуць жнеі, не галосяць,
Не заходзяцца душою ў спеве.
У людзей маўкліва хлеба просяць,
Бо чамусьці жыта позна спее.

Крошкі, што прынесены на бераг,
Пазнікалі голасна і ціха.
Нада мною столькі хустак белых...
Можа, тут і матчына хусцінка.

1974

Дзень нараджэння

Сорак восем ужо, сорак восем
Імянінных сакавікоў,
Жураўліных маіх саракоў,
Што ляцяць, набліжаючы восень.

Я гляджу на той лёт, на збліжэнне
З полем, дрэвамі, слотай зямной.
Быў аднойчы днём смерці маёй
Дзень вясны — дзень майго нараджэння.

Бачыў бой, бачыў землетрасенне,
Лес люблю, і дажджы, і траву.
Падымае мяне, ў чым жыву,
Дзень вясны — дзень майго паўтарэння.

1968

На хаце чырвоная зорка крылата
Напята — і прывітанне нам шле.
Вы лепей прыгледзьцеся: гэта ж не хата,
А шэры будзёнаўскі шлем.

Таго уявіце, хто з ворагам біўся,
Крывавы пот выцер: «Цяпер зажывем!» —
І вобземлю шлем свой... Шлем хатай зрабіўся,
Бо —
        быў гэта волата шлем...

1976

А здаецца, гэта мой зямляк...
Падыду па-свойску,
                                        прывітаю,
Пра знаёмых, блізкіх распытаю,
Аб жыцці і справах... што і як.

Між людзей вясёлых пастаім,
Перасыплем дробныя навіны,
Ўспомнім, што спяшацца мы павінны,
Як не будзе ўжо сказаць аб чым.

Ды паспешлівы спыняю крок,
Бачу — рысы тыя
                                        і не тыя.
Вінаватая усмешка стыне,
Пэўна, абазнаўся незнарок.

Вось калі б сустрэў цябе, зямляк,
Не ў натоўпе тлумным на пероне,
А ў сваім кутку, ў сваім раёне,—
Памыліцца б я не мог ніяк.

І прыкметны, і вядомы ты
На зямлі той добрай, мой таварыш,
На якой жывеш, працуеш, марыш,
На якой штодзённыя сляды.

Там і вуліцы, і цень страхі,
І буслы, знаёмыя з маленства,
Дамалёўваючы падабенства,
Да аблічча
                          дадаюць штрыхі.

1976

Ведалі — з баёў не ўсе мы вернемся,
Зорка лёсу не адна ўпадзе...
Ад сузор'яў, што ў снягах і верасе,
Выпраменьванне вялікай вернасці
Ў сэрцы к вам,
народжаным,
ідзе.

1976

На службу праводзім мы вас, землякі,
А восень то хмару, то сонца падыме...
Пад тымі ж сцягамі палкі,
Пад тымі,
Пад тымі.

Зямля вам і неба, дарога і дом,
І ўсё, што над вамі,
І ўсё, што пад вамі.
Дыханне і вернасць сцягам аддаём,
Становімся самі
Сцягамі.

1976

У гасцініцу — гатэль раённы,
Дзе паэтаў звёў дарожны лёс,—
Хлопец, у паэзію ўлюбёны,
Сціпла вершы ўласныя прынёс.

Пасвяціў усмешкай вінаватай:
Выбачайце, калі што не так...
Быў ён валасаты, рыжаваты,
Рукі загрубелыя,
Ў бінтах.

З рыштаванняў ён,
Ва ўсім рабочым,
З рыштаванняў ці граніт калоў?
Непрычэсаны, шурпаты почырк,
Сшытак тоўсты — без чарнавікоў.

І чытае ён сталічным знаўцам —
Паэтэсе юнай, двум дзядам —
Вершы пра вясну і касманаўтаў,
Пра тайгу, якой не бачыў сам.

Так знаёма ўсё ў лірычным спеве!..
Ды прызнаўся хлопец у журбе:
«Дарагая! Быццам колас спелы,
Звернут я каханнем да цябе!»

І, адчуўшы іншыя ўжо рысы,
Паэтэса вейкі узняла:
«А, здаецца, ён зусім не рыжы»,—
І — далоньку хлопцу падала.

1976

Новым вёснам,
Ліўням і грамам
Ветэраны аддаюць унукаў.
Застанемся мы ў сузор'ях:
Жукаў,
Ракасоўскі,
Баграмян.

У наступных вёснах і вятрах,
Можа, ўспомняць і яшчэ кагосьці.
Людзі, людзі,
мне б да вас у госці,
Ў добры свет,
без маршаў і атак...

Бачу, заўважаю, адчуваю
Шлях маіх дывізій і палкоў.
Ніткаю дарогі, што прайшоў,
Ніткай суравою без вузлоў
З будучым
мінулае сшываю.

1976

Час летніх вясёлых міграцый:
Пячыся
ці з сонцам плыві!
О, колькі аголеных грацый
Прымаюць
запас цеплыні!

Жанчына на пляж прыкульгала,
З ёй дзеці, нібы матылі.
Спякотнае плацце паклала
На тыя свае кастылі.

Красою б яна гаманіла,
Вось толькі нагі нестае.
Відаць, не на фронце... а міна
Спаткала ў маленстве яе.

Зірні на калецтва — й жахніся!..
Ў яе не жахлівы расказ:
— Знайшоўся дзівак... ажаніўся,
І дзетачак трое у нас.

1976

Такое на асфальце свята:
Латошыць грушу дзетвара!
Ўсяго ў тым груша вінавата,
Што ёсць ігруш на ёй багата,
Але няма гаспадара.

Не кожнаму цяпер вядома:
Сялібу ўзвёў паэт стары,
Быў дом, садочак каля дома,
Сабака, што баяўся грому
З тае ваеннае пары.

Забытыя паэмы, вершы
Чытач гартае ўсё радзей.
На дворышчы былым, на ўзмежжы
Старая груша — твор найлепшы —
Цвіце і радуе дзяцей...

1976

Улёгся верасовы дым,
Замоўк маторны спеў аб хлебе.
Гняздо грачынае у небе
Свіціцца кошыкам пустым.
Б'юць жорсткім сіверам вятры...
Чагосьці ў кошыку не стала,
Што дыхала, жыло, спявала
І саграбала свет знутры.
Дажджы і слота ўсё часцей,
Высь і зямля ў адным прадонні.
Няўтульна, зябка, нібы ў доме,
Ў якім
        калыска без дзяцей.

1976

Зноў з вятрамі паўночнымі
Завітала зіма.
Толькі снегу ні ў полі,
Ні ў лесе няма.

Не шукайце вы тайны
У бяссснежнасці зім.
Лепш, сябры-ветэраны,
На сябе паглядзім.

Сівізной зразумеем,
Што пазначаны мы
Так пявуча і звонка
Снежнай ласкай зімы.

1976

Нямыя

Тлумачыць можна нават кіем,
Тлумачыць можна і мятлою.
Нямыя размаўляюцьківам,
Вясёлых пальцаў
Мітульгою.

Нямыя моўчкі размаўляюць,
Нямую мову разумеюць.
Нямыя толькі не спяваюць,
Бо пець без голасу не ўмеюць.

Але ж вядуць свой спеў алені
І сінягубыя дэльфіны.
Мы ўчора толькі зразумелі,
Што адчуваюць нас расліны.

Гавораць не нямыя рукі,
І радасць, і журбу узносяць.
Мелодыя — не толькі гукі,—
Узлёт жыцця на светлай ноце.

Нямыя бачаць, заўважаюць
Спеў зорачкі ў пару начную.
Нямыя крыламі спяваюць,
Таму, на жаль, мы іх не чуем.

Свет гулкай цішынёй напяты,
І пахнуць зоры цішынёю.
Нямыя — гэта немаўляты
З дзіцячай чыстаю душою.

1976

Ціха ў мінулым, і ў будучым ціха,
З намі ўсе гукі і гул жыцця.
Цяжка ўздыхае зямля-парадзіха:
Заўтра якое ўзаўецца дзіця?

1976

Паміж Чорным і Каспійскім
Ёсць высокая гара.
Я сягоння спахапіўся,
Што дадому мне пара.

Сінякрылая краіна
З песняй сонца і арла
І паіла, і карміла,
І лячыла як магла.

Бачу — ў воблаках і дыме
Паўстаюць мае бары.
Адчуваю на радзіме
Развітальны цень гары.

1976

Быў добры дзядзька Міхалап,
Ён паважаў сабак і жаб
І ўсё жывое...
Дрэва ўпала
Ў глыбокім парку гарадскім.
На дне грымотнага абвалу
Дупло
і птушаняты ў ім.
Жаўтлявы пух на сінім целе,
І прызямленне без пары.
Ў нябачных крылах не згусцелі
Дажджы,
маланкі
і вятры.
Быў дзядзька тут і ўратаваў,
З сабою птушанят забраў.
Усім, чым мог, ён задаволіў
У доме з гоманам людскім.
І даў ім крылы, даў ім волю
У небе іхнім
І сваім.
І сам у выраі ўжо дзядзька —
Жыццё правёў, як светлы спеў.
І не яму — яго падзяка
Ва ўсім, што ён зрабіць паспеў.

1976

Дзяды сустрэліся, прыселі,
Дзяды — аб тым, дзяды — аб гэтым.
І пра здароўе, як пра сена:
«А ці касіў яшчэ ты летам?»

1976

Жанчына так апавядала:
— Усю дарогу да вакзала
Я на аднойназе стаяла:
Аўтобус повен, ледзь паўзе.
Стаю, а на маёй назе
Яшчэ аж дзесяць чалавек...

1976

Акопы, ямы, дол парваны
Перада мной, перад табой.
Зямля травою лечыць раны,
Травой, травой.

Травой бінтуе і сшывае,
Зялёныя гусцеюць швы.
Пакуль зямля твая жывая,
І ты — жывы.

Сваёю ж роднай назавеш ты,
Калі ў спякоце і расе
Табой пасеянае нешта
На ёй расце...

1976

Лямпачка свяціла, грэла,
Лямпачка перагарэла.
І свяча забытая ўсплыла
І абмыла стол і дзверы.
Цені — спадарожнікі святла —
Пасяліліся ў кватэры.
Вы з маленства, цені, вы з палёў,
Дзе мне кожны колас мілы?
Вы
 ад франтавых маіх сяброў,
Ад матулінай магілы?
Хто паслаў ка мне вас, хто прывёў
У паўночны час маўклівы?
Цені, цені — гэта рэпартаж,
Што зямля вяла пры сонцы.
Воіны і сцяганосцы...
Бачу вырыс непаўторны ваш,
Блізка ўсё — свіст кулі і крыла,
Песня кветкі на аблоні.
Цені — спадарожнікі святла,
Цёмныя яго далоні...

1976





Стому зведалі ногі і рукі,
У натузе гудзела спіна.
Ну, а ў твару якія нагрузкі? —
Толькі ўцеха ды радасць адна.

Сінявокі, прыгожы, бязвусы,
Ты сяброўку сваю цалаваў.
І свяцілі, ўсміхаліся вусны,
З неба зорачку зрок даставаў.

Той жа свет, па-вясноваму белы,
А маршчынкі-сцяжынкі ляглі...
Не адны, пэўна, ўсмешкі прабеглі,
Не адну толькі радасць вялі...

1976

Пэўна, ўжо лету мяжа:
Сячэ павуцінне імжа,
Сухога не знойдзеш у лесе лаўжа...
Сініца, прынясі вясну!

Падмёў лістапад сады,
Блакадаю — халады,
Знікнуць чыесьці пад снегам сляды...
Сініца, прынясі вясну!

Бясконцай здаецца зіма,
Сонца чакаю дарма,
А можа, не сонца — мяне ўжо няма?..
Сініца, прынясі вясну!

1976

— Неўталоннік,
Мой ты неўталоннік,—
Ушчувае праўнука старая.
Ён крычыць, малы, ў яе далонях,
А магчыма, гэтак ён спявае;

І прымае гэтак паўнамоцтвы
Ад жыцця адчутага і лёсу...
Я і сам гукаў бы колькі моцы,
Калі б жыць спачатку давялося.

Неўталоннік... Прага наталення?
Добра ж хлопчык песню пачынае.
Трэцяму ўжо служыць пакаленню
Вахта бабы Варачкі
Начная.

Не лічыла — колькі пахавала,
І не лічыць — колькі ўзгадавала.
Чула, што на свеце ёсць Купала,
Ды, на жаль, нічога не чытала.

Па-ранейшаму любоў і ласка
Свеціць вам, і праўнукі і ўнукі.
Толькі ж сіла дзе? Пералілася
З рук у рукі.
Ў маладыя рукі.

1976

— Чабарок мой, чабарок! —
Дзверы весела прапелі.
Дзякуй, дзякуй, свет мой белы,
Што сустрэчу мне збярог,
Што бацькоўскі ёсць парог.
Дзякуй, дзякуй, свет мой белы!

Тут гняздо маіх бацькоў,
Тут душы маёй прапіска —
Так далёка ўсё і блізка:
Выраі сакавікоў,
Жаўрукоў і ветракоў,
Так далёка ўсё і блізка.

Белы бусел на сасне,
Абеліскі пад сасною —
Ўсё маё і ўсё са мною.
Гора ў памяці на дне,
Усплывае толькі ў сне —
Ўсё маё і ўсё са мною.

І забыты след жыве,
Як трава, як ліст на дрэве,
Роднасць свеціць, роднасць грэе.
Маці ў полі на жніве,
Песня к праўнукам плыве,
Роднасць свеціць, роднасць грэе.

Песня маці — мой выток,
А працяг і абнаўленне —
Ў самым юным пакаленні.
Адгукаецца мой крок,
Адгукаецца мой зрок
Сёння ў юным пакаленні.

Столькі сцежак і шляхоў,
Па якіх нас лёс правёў,
Бачу быццам на экране.
Тым, хто ўперадзе пайшоў
Да наступных рубяжоў,—
Прывітанне, прывітанне!

1976





Ева жыве адна,
Прыбірае ў маленькай канторы.
Ў ягадах сёння яна
Ў сціплым звычайным уборы.

Ева жыве адна,
Не ўгледзела, як пастарэла.
Ў ягадах сёння яна
Дзень нараджэння сустрэла.

Быў тут аэрадром,
З гулу і вогнішчаў выраслі сосны.
З поўным ідзе вядром
Ева
    ў свой год высакосны.

Выйшла на вузел дарог.
Хтосьці жартуе няўдала:
— Еве лясун дапамог,
Бачыце, колькі набрала!

Ева на жарт не злуе,
Ўсмешкай настрой свой малюе:
— Дзякуй вам, рукі мае,
Дзякуй! —
                і рукі сабе цалуе.

1976

Даўнія кантузіі, раненні
Адгукнуцца болем, што не ўтоім.
А забыты выпраўка, раўненне,
Быццам зроду не хадзілі строем.

Ветэраны на сваім парадзе
Адзначаюць сёння Перамогу.
Паглядзець жа збоку,— то папраўдзе,—
Развучыліся хадзіць у ногу.

Нават тыя, нават тыя,
Палкавую школу што канчалі,
Ведалі прыёмы штыкавыя,
Павароты, строгі шаг чаканны.

Вельмі, вельмі быў аркестр дарэчы,
Медзь зайграла, заспявала, зазвінела.
Развінулі ветэраны плечы,
Грукнулі па бруку левай,
левай.

Духавыя гукі шлях акрэсляць,
Барабан шчыруе — ледзь не лопне.
...Так праводзяць нас цяпер аркестры,
То ўрачыста-звонка,
то жалобна.

1977

Пятрусь Бядулін

Быў ён першы вядомы паэт
У сваім Краснапольскім раёне.
(Я радкі падбіраю сягоння,
Як абрыўкі забытых газет.)

Ён за партай сядзеў у лапцях,
А ў чытанцы, у школьнай святліцы —
Верш яго, што вярнуўся з сталіцы
І цяпер нібы ў хлопца ў гасцях.

Слова — вёскі абуджанай дар,
Песня спее ў вачах і ва ўсмешцы.
Першы трактар заворвае межы,
Маці ў школе спасцігла буквар.

Новы свет — аж да сонца, да зор,
Неспазнаны яшчэ, неўгаданы.
Усім сэрцам яму ён адданы,
Ў сэрцы выклік, агонь і задор.

І — зіма ў глыбіні франтавой,
І — акоп на шматочку планеты.
Той зімою
                    пісалі паэты
Па снягах, па марозе
                                        крывёй...

1977

Пішу я на сасне,
Што сшыткам стала мне,
Паперай стала.

І думаю аб тым,
Што ў лесе не густым
Сасну звалілі.

Павалена сасна,—
Ў ёй човен берввяна
І дошка не адна
На ўсе патрэбы.

О колькі дрэў — не дроў
За век свой перавёў
Пяром маўклівым!

Пішу пра смерць, пра кроў,
Пішу я пра сяброў,
А іх жа, родных,

Хавалі на вайне,
Хавалі не ў труне,
І запаветам мне:
«Пра нас раскажаш...»

Пішу я на сасне,
Што сшыткам стала мне,
Паперай стала.

1977

Варачка

Гэтак звалі ў дзявоцтве яе,
І ўжо семдзесят год, а ўсё Варачка.
А турбот і ўзрушэнняў стае,
Не яе пад акном вабіць лавачка.

Не вярнуўся з-пад куляў Сямён,
А чацвёра пры ёй, і малодзенька.
А ўсё дробнай ды добрай сям'ёй
Неяк сеецца
І малоціцца...

Снег завей, белы цвет веснавы
Па-святочнаму ў косы ўплецены.
Над пражытым праносяцца сны —
Маладосці залётнай агледзіны.

І купальская ноч настае,
Маладзік з-пад вяночкаў выблісквае.
Ўсё жыве, ўсё цвіце, ўсё пяе,
І спатканне... такое ўжо блізкае:

— Ой, Сямён, Сямён,
ты мой Сенечка,
Абнімі мяне
харашэнечка...

1977



Балада аб чаканні

Выйшла жанчына к дарозе за вёску
І пры дарозе стала.
Роднага, блізкага з войска,
З фронту
                чакала.

Столькі чакала дзён, столькі ночак,
Белымі сталі косы і бровы.
Ўрос у зямлю кіёчак,
Стаў вярбою.

Дрэва, жанчыну змяніўшы, чакае
Сонца, к якому цягнуцца,
Дзетак са школы, з выраю чаек,
Ўсіх,
        каму трэба вярнуцца.

1977

Знявага і павага
Заўсёды побач крочаць.
Знявага і павага
Зрабіць паслугу хочуць.
Смялейшая — знявага,
Спрытнейшая — знявага:
Без клічу — адгукнецца,
К сустрэчнаму рванецца,
Не ўвеціць, не спытае,
Укусіць і аблае.
Даўно жыве знявага,
Жыве сабе няблага
У лесе, ў агародзе,
На лаўцы, на калодзе
І ў нечым кабінеце,
І ў нечым кабінеце...

1977

Хлопчык і тэлефон

Тэлефон насыпаў звону,
Ў калідоры гэты звон.
Хлопчык рвецца к тэлефону:
Дайце ў рукі тэлефон.

Трубку сам ён падымае,
Цягне праваю рукой.
З ім бабулька размаўляе:
— Добры дзень, унучак мой!

Павярнуўся, крутануўся:
Дзе бабулька, дзе сама?
І яшчэ раз азірнуўся:
А бабулечкі няма...

Толькі, толькі размаўляла,
І гукала, і вітала...
Ў трубку здзіўлена глядзіць:
Мо бабулька там сядзіць?

1977

Мову продкаў птушкі захавалі,
І разбойны свіст, і крык, і спеў:
З чалавекам разам дзень віталі,
Разам ляда ў пушчы карчавалі
І праводзілі кабылу ў хлеў.

Птушкі ў казку і ў буквар ляцелі;
Па вясне, узняўшыся з лугоў,
Падымалі нашы летуценні
Аж да Млечных згорбленых Шляхоў.

Крылы мы даўно сабе зрабілі —
Столькі ў нас крылатае радні!..
Мітусні ж занадта вераб'інай,
Салаўінай мала дабрыні.

1977

Як трасло,
Грымела ў Бухарэсце —
Ў Магілёве ў час начны пачулі.
Вокны, люстры на маім паверсе
Здрыгануліся ў маўклівым гуле.

Зазвінела тоненькае шкельца,
Зараз, зараз з вышыні сарвецца...
Гэта яшчэ раз пасля Ташкента
Мне пагрукала планета ў сэрца.

І ўжо ў сэрцы ўскалыхнула гулка
Ўсе шляхі мае між небасхілаў;
У куточку ўсхліпнула рачулка,
Быццам страшны сон яна прысніла.

Дзесь руіны там — над эпіцэнтрам,
Быццам бы вайна зноў пахадзіла.
Боль і гэты па-салдацку сцерпім:
Грозна ўсё ў прыродзе — ды праўдзіва.

Несучы і смерць і разбурэнне,
Шар зямны няшчадна патрасае.
Толькі б, толькі не землетрасенне,
Што рыхтуюць людзям
людзі самі.

1977

Шчаслівая латарэя:
З'явіцца —
і ўбачыць свой свет прад сабой.
Радзіма мая не старэе
Ні сонцам,
ні лесам сваім, ні травой.
І свеціць яна, і спявае
І кожнай расінкай,
і кожным лістком.
Зязюля ў тым садзе кувае,
Дзе чуў я калісьці яе, .
хлапчуком...

1977

Змест

«Здаецца, ўстаў я рана-рана...» 3
Віншавальныя паштоўкі 4
«Вецер па-свойску сустрэчны...» 5
«Туркоча дзікі голуб на сасне...» 6
«Жалезніца, Касцягаўка, і Горна...» 7
«Аддаваў цябе лесу і бору...» 10
«Па-над горадам у сіняве...» 11
«Мы па латгальскай крочылі зямлі...» 12
«А снег — у кожнага ён свой...» 13
«Апошні снег і першы дождж...» 14
«Старому, мусіць, дзевяноста...» 15
«З самай раніцы абход пачне...» 16
«Так грымела, так свяціла...» 17
«Ёсць на свеце мой алень...» 18
«Хоць сэрца хтось лічыў жывым...» 19
«Ветракі старыя, ветракі...» 20
«На дрэвах пры бальшаку...» 21
«— Па-лабавому зноў, дзівіцеся!..» 22
«...А хтосьці з той стралковай роты...» 23
«І мне памяняць бы кватэру...» 26
Каханы Роў 27
«Пасадзілі ля дома бярозку...» 28
«Не, не ўсё наўмысла робім...» 29
«Знаёмы дзядзькаў двор. Каля двара...» 30
«Мяркуй, што робіш для душы сваёй...» 31
«Што світанне ў вербах тоіць...» 32
«Вось так ляжы сабе, нібы на пляжы...» 33
«Не ўгнацца мне за тымі маладымі...» 34
«Вы лічыце — птушкі спяваюць...» 35
Добры конік «Запарожац» 36
«Я ведаю — я вінаваты...» 38
Прыцягненне 39
Балада пра камбата 40
«Хмарынку ручаі напояць...» 41
«Не на пляжы у Паланзе...» 42
«Сасна і кусты іван-чаю...» 44
«Дняпроўскі мост і маладзік адталы...» 45
«Сабака брэша — лічаць так з вякоў...» 46
«Пахаваны тут франтавікі...» 47

«Па Млечных Шляхах...» 48
«Пачаць бы дзень звычайны свой...» 49
Чайкі 50
Дзень нараджэння 51
Балада пра шлем 52
«А здаецца, гэта мой зямляк...» 53
«Ведалі — з баёў не ўсе мы вернемся...» 54
«На службу праводзім мы вас, землякі...» 55
«У гасцініцу — гатэль раённы...» 56
«Новым вёснам...» 57
«Час летніх вясёлых міграцый...» 58
«Такое на асфальце свята...» 59
«Улёгся верасовы дым...» 60
«Зноў з вятрамі паўночнымі...» 61
Нямыя 62
«Ціха ў мінулым, і ў будучым ціха...» 63
«Паміж Чорным і Каспійскім...» 64
«Быў добры дзядзька Міхалап...» 65
«Дзяды сустрэліся, прыселі...» 66
«Жанчына так апавядала...» 67
«Акопы, ямы, дол парваны...» 68
«Лямпачка свяціла, грэла...» 69
«Стому зведалі ногі і рукі...» 72
«Пэўна, ўжо лету мяжа...» 73
«— Неўталоннік...» 74
«— Чабарок мой, чабарок!..» 75
«Ева жыве адна...» 78
«Даўнія кантузіі, раненні...» 79
Пятрусь Бядулін 80
«Пішу я на сасне...» 81
Варачка 82
«Падымаецца камочак песні...» 83
Балада аб чаканні 86
«Знявага і павага...» 87
Хлопчык і тэлефон 88
«Мову продкаў птушкі захавалі...» 89
«Як трасло...» 90
«Шчаслівая латарэя...» 91

Алексей Васильевич Пысин

Есть в мире мой олень

Стихи

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»

На белорусском языке

Рэдактар В. Б. Спрынчан.

Мастацкі рэдактар Е. М. Малышава.

Тэхнічны рэдактар Л. М. Шлапо.

Карэктар Л. М. Вайцяшэня.

ІБ № 92

Здадзена ў набор 29.12.77. Падп. да друку 25.05.78. АТ 09701. Фармат 60×108[1]/16. Папера афс. № 1. Гарнітура звычайна-новая. Друк высокі. Ум. друк. арк. 7.80. Ул.-выд. арк. 2,78. Тыраж 6800 экз. Зак. 888. Цана 50 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, Паркавая магістраль, 11.

Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

Пысін А.
П 94 Ёсць на свеце мой алень: Вершы.— Мн.: Маст. літ., 1978.— 96 с., іл.

«Ёсць на свеце мой алень» — новы зборнік вядомага паэта, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР Аляксея Пысіна. Паэзія яго пахне порахам і дабрынёй да жыцця. Гэтыя рысы характэрны і для новай кнігі.

П $\frac{70403-120}{М 302(05)-78}$ 57—78 Бел 2